## *§ 46–0. Краіны Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі

**ДЭКАЛАНІЗАЦЫЯ МАДЭРНІЗАЦЫЯ**
**РЭФОРМЫ КАЛОНІЯ**
**«КРАІНЫ, ЯКІЯ РАЗВІВАЮЦЦА»**
**КРАІНЫ «ТРЭЦЯГА СВЕТУ»**

**Перадумовы дэкаланізацыі**

**1. Дэкаланізацыя і яе асноўныя этапы.** Пасля Другой сусветнай вайны пачаўся працэс распаду каланіяльных імперый вядучых дзяржаў Захаду, што атрымаў назву *дэкаланізацыі*. У выніку вайны Вялікабрытанія, Францыя і іншыя дзяржавы, якія валодалі большасцю калоній, былі аслаблены. Яны не мелі дастаткова сіл, каб утрымліваць калоніі пад сваёй уладай. Еўрапейцы, перажыўшы спусташальную вайну, не хацелі ваяваць супраць народаў калоній, што змагаліся за сваю незалежнасць. Войны, якія вялі Францыя і Нідэрланды, каб захаваць кантроль над В'етнамам (1946–1954 гг.) і Інданезіяй (1945–1949 гг.) адпаведна, скончыліся перамогай народаў гэтых калоній, што неўзабаве зрабіліся незалежнымі дзяржавамі.

Успомніце, якія яшчэ гістарычныя працэсы паскорылі дэкаланізацыю.

**Падтрымка СССР народаў каланіяльных краін у барацьбе за незалежнасць**

Значную падтрымку народам каланіяльных краін у барацьбе за незалежнасць аказаў Савецкі Саюз. Яна ўключала матэрыяльную, у тым ліку ваеннатэхнічную, дапамогу. СССР выступіў адным з ініцыятараў прыняцця ў 1960 г. Генеральнай Асамблеяй ААН Дэкларацыі аб наданні незалежнасці каланіяльным краінам і народам. Барацьба народаў калоній знаходзіла падтрымку і спачуванне сярод савецкіх людзей. У БССР у тыя гады таксама праходзілі разнастайныя масавыя мерапрыемствы, удзельнікі якіх патрабавалі надання незалежнасці каланіяльным краінам.

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

### З Прэамбулы Афрыканскай Хартыі правоў чалавека і народаў



Афрыканскія дзяржавы — члены Арганізацыі афрыканскага адзінства, якія падпісалі гэтую канвенцыю, пацвярджаюць урачыстае абяцанне выкараніць усе формы каланіялізму ў Афрыцы, каардынаваць і інтэнсіфікаваць сваё супрацоўніцтва і намаганні ў мэтах забеспячэння лепшага жыцця для народаў Афрыкі, а таксама развіваць міжнароднае супрацоўніцтва, строга кіруючыся Статутам Арганізацыі Аб'яднаных Нацый і Усеагульнай дэкларацыяй правоў чалавека…

*1. Вызначце мэты стварэння Арганізацыі афрыканскага адзінства.*
*2. Якім чынам Арганізацыя афрыканскага адзінства планавала дасягаць гэтых мэт?*
*3. Ці дасягнутыя пастаўленыя мэты ў наш час? Аргументуйце сваю думку.*

Дэкаланізацыю можна лічыць завершанай з моманту набыцця ў 1990 г. незалежнасці Намібіяй — апошняй калоніяй на афрыканскім кантыненце. У выніку дэкаланізацыі на карце свету з'явілася каля 100 новых незалежных дзяржаў.

**Этапы дэкаланізацыі**

| **1945 г. — сярэдзіна 1950-х гг.** | **Сярэдзіна 1950-х — сярэдзіна 1970-х гг.** | **Сярэдзіна 1970-х — пачатак 1990-х гг.** |
|---|---|---|
| Незалежнасць атрымалі 11 дзяржаў у Азіі і 1 у Афрыцы (Лівія) | Незалежнасць атрымала значная частка краін Трапічнай і Паўднёвай Афрыкі | Крах партугальскай каланіяльнай імперыі, завяршэнне дэкаланізацыі |

Вынікам дэкаланізацыі былі некаторыя міжнародныя канфлікты, што цягнуцца да нашых дзён.

Вызваленне Карэі з-пад улады Японіі было ажыццёўлена Чырвонай арміяй (поўнач) і войскамі ЗША (поўдзень краіны). У выніку ўтварыліся дзве дзяржавы, якія абралі розныя мадэлі развіцця. Карэйская Народна-Дэмакратычная Рэспубліка (КНДР) пайшла шляхам сацыялізму, а ў Рэспубліцы Карэя зацвердзіўся капіталізм. Супрацьстаянне паміж імі прывяло да вайны 1950–1953 гг. Канфлікт не ўрэгуляваны да цяперашняга часу.

**Міжнародныя канфлікты**

Ад часу дэкаланізацыі бярэ свой пачатак канфлікт на Блізкім Усходзе. У 1947 г. Генеральная Асамблея ААН прыняла рашэнне стварыць на тэрыторыі Палесціны, якая знаходзілася пад уладай Вялікабрытаніі, дзве дзяржавы: арабскую і яўрэйскую. Яўрэйскае насельніцтва Палесціны ў 1948 г. абвясціла дзяржаву Ізраіль. Арабы не пагадзіліся з падзелам Палесціны і не прызналі Ізраіль. Арабская дзяржава ў Палесціне так і не была створана. Блізкі Усход перажыў шэраг войнаў паміж арабскімі краінамі і Ізраілем. Ваенна-палітычнае супрацьстаянне тут не спыняецца і сёння.

**2. Тэорыя мадэрнізацыі.** У 1950-я гг. вучонымі была створана тэорыя мадэрнізацыі для тлумачэння гістарычнай мінуўшчыны і сучаснасці. Згодна з гэтай тэорыяй мадэрнізацыя разглядаецца як працэс абнаўлення ўсіх сфер жыцця таго ці іншага грамадства. Яна выяўляецца перш за ўсё ў пераходзе ад традыцыйнага грамадства да сучаснага, ад аграрнага да індустрыяльнага.

**Першасная мадэрнізацыя**

Першыя на гэты шлях сталі краіны Захаду. Іх развіццё называюць прыкладам першаснай мадэрнізацыі, гэта значыць мадэрнізацыі не запазычанай, а здзейсненай дзякуючы ўнутраным фактарам.

**Другасная мадэрнізацыя**

Другасная (даганяючая) мадэрнізацыя ажыццяўлялася як адказ на выклік з боку больш развітых заходніх краін. Развіццё дзяржаў Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі з'яўляецца прыкладам даганяючай

мадэрнізацыі. Элементы гэтага тыпу мадэрнізацыі, як, напрыклад, еўрапейскія культурныя і навукова-тэхнічныя дасягненні, пачалі ўкараняцца яшчэ ў перыяд існавання калоній. Пасля здабыцця імі незалежнасці гэты працэс значна паглыбіўся і набыў маштабны характар. Пры гэтым даганяючая мадэрнізацыя ў краінах, якія развіваюцца, рабіла стаўку на індустрыялізацыю, з дапамогаю якой, як лічылі, эканамічна адсталая краіна можа дасягнуць узроўню высокаразвітых дзяржаў.

**3. Шляхі развіцця вызваленых краін.** За новымі незалежнымі дзяржавамі Азіі і Афрыкі, а таксама краінамі Лацінскай Амерыкі замацавалася назва «краіны, якія развіваюцца» або краіны «трэцяга свету».

Краіны «трэцяга свету»

У залежнасці ад абранага шляху грамадскага развіцця іх можна падзяліць на тры асноўныя групы.

**Шляхі развіцця краін «трэцяга свету»**

| Капіталістычны | Сацыялістычны | Краіны «сацыялістычнай арыентацыі», якія абвясцілі пра будаўніцтва сацыялізму з улікам сваіх нацыянальных умоў |
|---|---|---|
| Паўднёвая Карэя, Філіпіны, Сінгапур, Тайланд, Кувейт, Катар, ААЭ | Манголія, В'етнам, Кітай, Лаос, Кампучыя (Камбоджа), КНДР, Куба | Афганістан, Алжыр, Эфіопія, Ангола, Егіпет, Ірак, Нікарагуа |

Асаблівы шлях развіцця КНР

Найбуйнейшай дзяржавай сярод краін «трэцяга свету» з'яўляецца Кітай. У выніку перамогі Камуністычнай партыі Кітая ў грамадзянскай вайне ў 1949 г. была створана Кітайская Народная Рэспубліка (КНР) і краіна пайшла шляхам будаўніцтва сацыялізму. Кіраўнік КНР Маа Цзэдун абвясціў асаблівы шлях развіцця сваёй краіны. З дапамогай «вялікага скачка» ў эканамічным развіцці КНР павінна была ў самыя кароткія тэрміны пабудаваць сацыялізм, а пасля і камунізм, апярэдзіўшы Савецкі Саюз. Пасля смерці Маа Цзэдуна ў 1976 г. новае кі-

раўніцтва краіны адмовілася ад такой палітыкі і ўзяло курс на правядзенне рыначных рэформаў у эканоміцы пры захаванні манаполіі Камуністычнай партыі на ўладу. Ужо ў 1980-я гг. рэформы прывялі да значнага росту кітайскай эканомікі і ўзроўню жыцця людзей.

### Перашкоды на шляху да прагрэсу

Краінам, якія сталі на шлях незалежнага развіцця, належала вырашаць складаныя задачы будаўніцтва сваёй дзяржавы і пераадолення эканамічнай адсталасці. У вырашэнні гэтых задач большасць краін, асабліва ў Афрыцы, сутыкнуліся з праблемамі. На іх тэрыторыі, як правіла, жылі людзі, якія належалі да розных этнічных і рэлігійных груп. Нестабільны палітычны лад і нізкі ўзровень жыцця спараджалі шматлікія канфлікты, у тым ліку этнічныя і рэлігійныя. Звычайнай з'явай для краін, якія развіваюцца, былі грамадзянскія войны і дзяржаўныя

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

**З кнігі М. Ярашэнкі «Калі, дзе, як і чаму гэта адбылося. Павароты гісторыі: падзеі і факты»**

Эканоміка шмат якіх дзяржаў Афрыкі трапіла ў залежнасць ад экспарту толькі аднаго прадукту. Змены ў сусветным гандлі або падзенне цэн маглі цалкам падарваць іх эканоміку. Іншым вынікам гэтых працэсаў была палярызацыя багацця і ўлады. Нешматлікая эліта, якая часцяком была карумпаваная і абслугоўвала інтарэсы адной сям'і або аднаго племені, панавала ў краіне, масы народу пакутавалі ад падзення жыццёвага ўзроўню. Звычайнай рэччу зрабіліся ваенныя перавароты, у якіх армія выступала ў ролі сумленнай патрыятычнай сілы.

Перавароты аднаўлялі парадак, але вайскоўцы не маглі кіраваць эканомікай, і даводзілася або дапускаць у нейкай форме грамадзянскае кіраванне, або станавіцца на шлях дыктатуры.

1. *У чым выяўляецца залежнасць эканомікі большасці краін Афрыкі ад сусветнай эканомікі?*
2. *Як адметнасці эканамічнага развіцця гэтых дзяржаў уплываюць на палітычнае жыццё? Ці можна лічыць палітычнае развіццё краін Афрыкі стабільным?*
3. *Прапануйце магчымыя шляхі выхаду з сітуацыі, якая склалася.*

перавароты. Актыўную ролю ў палітычным жыцці адыгрывала армія.

Для краін Лацінскай Амерыкі, хоць яны і здабылі незалежнасць значна раней, чым азіяцкія і афрыканскія дзяржавы, таксама была характэрная вялікая роля вайскоўцаў у палітычным жыцці. У 1960–1980-я гг. перыяды ваенных дыктатур перажылі Бразілія, Аргенціна і Чылі. Захоўвалася залежнасць эканомік маладых дзяржаў ад метраполій.

Залежнасць ад попыту на рынку на абмежаваны пералік тавараў

Краіны «трэцяга свету» пастаўлялі на сусветны рынак сельскагаспадарчую прадукцыю, сыравіну, а куплялі дарагія прамысловыя тавары. Шмат у якіх новых дзяржавах была наладжана вытворчасць аднаго-двух відаў прадукцыі, напрыклад цукру, какавы або медзі. Таму іх эканомікі знаходзіліся ў поўнай залежнасці ад попыту на сусветным рынку на вельмі абмежаваны пералік тавараў. Адмоўна на эканамічнае развіццё многіх краін, асабліва Афрыкі, уплывалі неспрыяльныя ўмовы надвор'я.

Дапамога СССР былым калоніям

СССР аказваў дапамогу былым каланіяльным краінам: даваў крэдыты, пастаўляў абсталяванне для прамысловасці і сельскай гаспадаркі. Пры садзеянні СССР у былых каланіяльных краінах будавалі прамысловыя прадпрыемствы, гідраэлектрастанцыі, навучальныя ўстановы, бальніцы, стадыёны і інш. Савецкія спецыялісты працавалі ў розных галінах эканомікі, навучалі мясцовае насельніцтва і перадавалі свой досвед. У Маскве быў створаны Універсітэт дружбы народаў для падрыхтоўкі кадраў з былых каланіяльных краін. БССР разам з іншымі рэспублікамі СССР аказвала маладым дзяржавам значную эканамічную дапамогу, рыхтавала нацыянальныя кадры.

Новыя індустрыяльныя дзяржавы

Напрыканцы 1980-х гг. шэраг краін Азіі — Рэспубліка Карэя, Сінгапур, Малайзія — здолелі дасягнуць істотных поспехаў у развіцці прамысловасці і ўвайшлі ў лік «новых індустрыяльных дзяржаў». У Лацінскай Амерыцы значны крок у эканамічным развіцці ў гэты час зрабілі Чылі і Бразілія.

*У выніку дэкаланізацыі паўстала вялікая колькасць новых незалежных дзяржаў. У той час як некаторыя краіны, што вызваліліся ад каланіяльнай залежнасці, мелі пэўны прагрэс у развіцці, іншыя знаходзіліся ў сітуацыі палітычнай і эканамічнай нестабільнасці.*

**калі ў свеце…**

1990 г. — абвяшчэнне незалежнасці Намібіі, апошняй буйной афрыканскай калоніі

**на тэрыторыі Беларусі…**

1990 г. — прыняцце Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Назавіце фактары, якія паспрыялі працэсу дэкаланізацыі. Вылучыце асноўныя этапы дэкаланізацыі пасля Другой сусветнай вайны.
2. Які ўплыў на развіццё краін Азіі і Афрыкі аказала «халодная вайна»? Вызначце шляхі развіцця краін, якія вызваліліся.
3. У чым сутнасць тэорыі мадэрнізацыі? Да якога тыпу мадэрнізацыі адносяцца краіны Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі?
4. Якія агульныя праблемы неабходна было вырашыць краінам, што вызваліліся ад каланіяльнай залежнасці, каб правесці мадэрнізацыю?